# Практыкаванні са слоўнікавымі словамі

## II клас*

### Тэатр

*1. Разгадайце рэбус і запішыце слоўнікавае слова, якое ў вас атрымалася.*

ТЭ '  ,,

*Пастаўце націск у слоўнікавым слове.*

*2. Якая літара «збегла» са слова? Злучыце яе з месцам пропуску ў слове.*

е і э

т..атр

*3. Дапоўніце сказ слоўнікавым словам.*

У нядзелю настаўніца і вучні наведалі ________.

*4. Прачытайце спалучэнні слоў. Дапішыце прапушчаныя літары на месцы пропускаў.*

Т..атральная сцэна, т..атральная зала, т..атральны сезон.

*Пастаўце націск у словах.*

*5. Дапішыце патрэбнае слоўнікавае слова ў спалучэнні слоў.*

☐ Нацыянальны акадэмічны вялікі __________ оперы і балета.

☐ __________ юнага гледача.



*Адзначце знакам ✓ у квадраце назву тэатра, якая адпавядае малюнку.*

### Месяц

*1. Разгадайце рэбус і запішыце слоўнікавае слова, якое ў вас атрымалася.*

А = Е

 ,, ЯЦ

*Пастаўце націск у слоўнікавым слове.*

*2. Якая літара «збегла» са слова? Злучыце яе з месцам пропуску ў слове.*

е я і

мес..ц

*3. Прачытайце і адгадайце загадку. З «рассыпаных» літар складзіце слова-адгадку.*

Як маленькі — я  
рожкі мае,  
хмаркі ён м  
на іх гайдае. ц  
Падрасце —  
бы шар агністы, е  
свеціць нам  
у небе чыстым. с

*Анатоль Прохараў* [1, с. 23]

*4. Дапоўніце загадку слоўнікавым словам. З «рассыпаных» складоў складзіце і запішыце слова-адгадку.*

Хочаш выправіцца ў казку  
ці на _______? Калі ласка!  
Гэта што за хуткалёт, ка  
што бярэ ў такі палёт? дум

*Уладзімір Паўлаў* [2, с. 15]

*5. Дапоўніце сказ слоўнікавым словам.*

Верасень — першы ______________ восені.

*6. Прачытайце верш. Дапішыце прапушчаныя літары ў словы.*

**Мес..ц**

Едзе мес..чык на хмарках.  
Эх, імчацца яны шпарка!  
Хмаркі, хмаркі, асцярожна,  
Так і мес..ц скінуць можна!

*Ніна Галіноўская* [3, с. 42]

* Малюнкі да слоўнікавых слоў змешчаны на каляровай укладцы.

### Метро

*1. Разгадайце рэбус і запішыце слоўнікавае слова, якое ў вас атрымалася.*

**А = Е**



**,**

*Пастаўце націск у слоўнікавым слове.*

*2. Закрэсліце літару, якая сустракаецца часцей за астатнія. Запішыце слова, якое атрымалася.*

М А Е А Т А Р А О А

*Абвядзіце слова, якое «схавалася» ў слоўнікавым слове.*

*3. Якая літара «збегла» са слова? Злучыце яе з месцам пропуску ў слове.*

[е] [я] [і]

м[..]тро

*4. Дапоўніце сказы слоўнікавым словам.*

Гарадская падземная электрычная чыгунка — гэта ___________.

У Мінску будуецца новая лінія _________.

### Памяць

*1. Разгадайце рэбус і запішыце слоўнікавае слова, якое ў вас атрымалася.*

**,,**   **,** **ЦЬ**

*Пастаўце націск у слоўнікавым слове.*

*2. Якая літара «збегла» са слова? Злучыце яе з месцам пропуску ў слове.*

[е] [я] [і]

пам[..]ць

*3. Дапоўніце сказы слоўнікавым словам.*

1) Не так лёгка выкінуць з _________*і* здарэнне на рэчцы.

2) Дзяўчынка перабірала ў __________*і* падзеі апошняга тыдня.

3) Уладзік вывучыў верш на ____________.

*Злучыце вобразныя выразы з іх значэннем.*

**на памяць** **выкінуць з памяці**

| | | |
|---|---|---|
| не звяртаўся да тэксту, помніў што-небудзь | перастаць думаць пра кагосьці, штосьці | успамінала, абдумвала паслядоўна адно за адным |

**перабірала ў памяці**

*4. Прачытайце верш. Дапоўніце яго слоўнікавым словам.*

Восем лісточкаў пад клёнам,
Быццам бы зорачак восем,
Скінула ўзорам чароўным
Ціхая жоўтая восень.
Два — падарую матулі,
Два — аднясу я сястры,
Два — адашлю я бабулі,
Два — ты на__________ бяры.

*Міхась Пазнякоў* [4, с. 12]

*У слоўнікавым слове падкрэсліце літары, якія абазначаюць мяккія зычныя гукі.*

*5. Прачытайце словы, якія «схаваліся» ў слоўнікавым слове. Выкарыстоўвайце белыя клеткі-падказкі. Запішыце словы.*

| п | а | м | я | ц | ь |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | |
| | | | | | |

______

______

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Вясёлка. — 2010. — № 3. — С. 23.
2. Вясёлка. — 2008. — № 5. — С. 15.
3. *Галіноўская, Н. В.* Калі я шчаслівы : вершы, казкі, жарты, небыліцы : для дзяцей мал. шк. узросту / Н. В. Галіноўская ; маст. Галіна Хінка-Янушкевіч. — Мінск : Звязда, 2013. — 160 с.
4. *Пазнякоў, М. П.* Святло дабрыні : азбука, лічэбнікі, лічылкі, вершы, скорагаворкі, каламбуры, загадкі, крылатыя выразы, казка : для дзяцей мал. і сярэд. шк. узросту / М. П. Пазнякоў. — Мінск : Звязда, 2015. — 320 с.

**Крыніцы ілюстрацый:** http://listok-perm.ru/image/cache/data/product/125551-800x800.jpg; http://www.pngonly.com/wp-content/uploads/2017/06/Carnival-Mask-Perfect-Purple-PNG.png; https://www.veronika-kaiser.de/wp-content/uploads/2011/01/lupe.jpg; https://gtoys.com.ua/images/products/rv0012789_1.jpg; https://yandex.by/images/search.

***Свірыдзенка В. І.**, кандыдат педагагічных навук, дацэнт;*
***Антановіч Н. М.**, кандыдат педагагічных навук, дацэнт.*
*Кафедра беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ*